[4] *Παπαδόπουλος Φ.Ι.* Ελληνική βιβλιογραφία (1466–1800). Т. 1–2. Αθηναι, 1984.

[5] *Φραγκισκος Εμ. Ν., Φλωρεντης Χ.* Πατμιακή βιβλιοθήκη. Κατάλογος των εντύπων (15ος– 19ος αι.). Т. Α΄–Β΄. Αθήνα, 1993.

[6] *Киселев Н.П.* Греческая печать на Украине в XVI в. Иван Федоров и его последователи // Книга: Исследования и материалы. Москва, 1962. Сб. 7. С. 171–198.

[7] *Запольская Н.Н.* Книжная справа XVII в.: проблема культурно-языкового реплицирования // Studia Russica. XVIII. Budapest, 2000. С. 305–314; *Запольская Н.Н.* Книжная справа в культурно-языковых пространствах Slavia Orthodoxa и Slavia Latina // XIII Международный съезд славистов. Любляна, 2003. Доклады российской делегации. Славянское языкознание. Москва, 2003. С. 213–230, и др. См. также: *Крылов Г., протоиерей.* Книжная справа XVII века. Богослужебные Минеи. Москва, 2009. С. 79–101.

[8] *Рамазанова Д.Н.* Рукописная и печатная книга в учебной практике Славяно-греко-латинской Академии в конце XVII века // «В России надо жить по книге». Начальное обучение чтению и письму (Становление учебной книги в XVI–XIX вв.). Москва, 2015. С. 42–52.

[9] *Рамазанова Д.Н.* 1) «Треязычный лексикон» Федора Поликарпова в собрании Музея книги Российской государственной библиотеки // Вивлиофика: История книги и изучение книжных памятников. Вып. 1. Москва, 2009. С. 156–176; 2) Славяно-греко-латинский Букварь Федора Поликарпова (1701 г.): история создания и источники // Вестник Православного Свято-Тихоновского Гуманитарного Университета. Серия IV: «Педагогика. Психология». Вып. 4 (31). 2013. С. 78–88.

[10] *Рамазанова Д.Н.* Источниковедческие проблемы изучения состава личной библиотеки Иоанникия и Софрония Лихудов // Чертковские чтения: материалы второй научной конф. 26–27 сент. 2012. Москва, 2013. С. 36–151.

[11] *Рамазанова Д.Н.* Греческие и латинские книги XVI–XVIII вв. из собрания архимандрита Евфимия (Ливерия) Колетти: проблемы источниковедческого исследования // Вестник РГГУ. Сер. «Исторические науки. Историография, источниковедение, методы исторических исследований». 2011. № 12 (74)/11. С. 224–235.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ж.Л. Раманава*

# Праблемы і перспектывы функцыянавання інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры ў грамадстве

У артыкуле разглядаецца праблема павышэння эфектыўнасці распаўсюджвання і выкарыстання твораў беларускай мастацкай літаратуры. Прыводзяцца дадзеныя статыстычных даследаванняў, якія сведчаць аб складанай сітуацыі з выкарыстаннем беларускай мастацкай літаратуры ў грамадстве, аб невялікай яе долі ў структуры чытання дзяцей і дарослых. Аўтарам прапануюцца шляхі вырашэння праблемы, сярод якіх забеспячэнне доступу карыстальнікаў да разнастайнага спектру інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры, у тым ліку і ў інтэрнэт-асяроддзі, іх папулярызацыя праз бібліятэкі, установы сацыякультурнай сферы, сродкі масавай інфармацыі, Інтэрнэт.

*Ключавыя словы*: мастацкая літаратура, статыстычныя даследаванні, читателеведение, чытанне дзяцей і дарослых.

*Ж.Л. Романова*

# Проблемы и перспективы функционирования информационных ресурсов белорусской художественной литературы в обществе

В статье рассматривается проблема повышения эффективности распространения и использования произведений белорусской художественной литературы. Приводятся данные статистических исследований, которые свидетельствуют о сложной ситуации, связанной с использованием белорусской художественной литературы в обществе, о небольшой ее доле в структуре чтения детей и взрослых. Автором предлагаются пути решения проблемы, среди которых обеспечение доступа пользователей к разнообразному спектру информационных ресурсов белорусской художественной литературы, в том числе и в интернет-среде, их популяризация через библиотеки, учреждения социокультурной сферы, средства массовой информации, Интернет.

*Ключевые слова*: художественная литература, статистические исследования, читателеведение, чтение детей и взрослых.

*Zhanna L. Romanova*

# Problems and perspectives of the Belarusian literature information resources functioning in society

The article considers the problem of the distribution efficiency improving and use of the Belarusian fiction compositions. It provides data of statistical studies, which evidence of the complex situation with the use of the Belarusian literature in society and its small share in the structure of the children and adults reading. The author offers solutions of the problem: enabling users to access a varied range of information resources of Belarusian literature, including in the Internet environment, and their promotion through libraries, institutions of social and cultural sphere, media and the Internet.

*Keywords*: literature, statistical studies, reading science, reading of children and adults.

Важную ролю ў выхаванні, адукацыі, інтэлектуалізацыі чалавека і грамадства, фарміраванні іх культурнага патэнцыялу адыгрывае мастацкая літаратура, асабліва нацыянальная, якая з'яўляецца моцным сродкам пазнання рэчаіснасці і ўздзеяння на эмацыянальную сферу чалавека, садзейнічае разнавектарнаму развіццю яго асобы. Творы нацыянальнай літаратуры ўтвараюць нацыянальныя галіновыя інфармацыйныя рэсурсы, якія будучы носьбітамі мастацка-вобразных ведаў, інструментам эстэтычнай камунікацыі, інфармацыйнага забеспячэння сфер вольнага часу, навуковай, адукацыйнай, прафесійнай, садзейнічаюць трансляцыі каштоўнасцей нацыянальнай культуры, з'яўляюцца сродкам выхавання нацыянальнай свядомасці, захавання культурнай і моўнай ідэнтычнасці і разнастайнасці ў свеце. У гэтай сувязі вельмі важным з'яўляецца вырашэнне праблем, звяза-

ных з функцыянаваннем інфармацыйных рэсурсаў нацыянальнай мастацкай літаратуры ў грамадстве, а гэта значыць з іх выданнем, распаўсюджваннем і чытаннем.

Для Рэспублікі Беларусь найдзвычай востра стаіць пытанне павышэння эфектыўнасці выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры, што абумоўлена невялікай доляй нацыянальнай літаратуры ў структуры чытання дзяцей і дарослых, аб чым сведчаць вынікі навуковых сацыялагічных даследаванняў. Так, даследаванне чытання аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў ВНУ Рэспублікі Беларусь, якое праводзілася Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа, паказала, што беларуская літаратура ў структуры чытання дадзеных катэгорый карыстльнікаў займае адно з апошніх месцаў і складае ўсяго 16%. Дадзеныя даследавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі стану і тэндэнцый развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь сведчаць, што доля беларускіх аўтараў у структуры дзіцячага чытання складае каля 7%. Пры гэтым ніколі не звяртаюцца да твораў беларускай літаратуры 37% рэспандэнтаў, а 66% прызнаюцца, што чытаюць яе толькі для падрыхтоўкі да ўрокаў і аддаюць перавагу перакладам беларускай літаратуры на рускую мову. У рэйтынгу любімых кніг бацькоў творы беларускіх аўтараў адсутнічаюць. Не назвалі яны іх і сярод кніг, якія жадаюць набыць для чытання[1]. Выкладчыкі і бібліятэкары сярод 10 кніг, якія неабходна прачытаць дзецям адзначылі толькі творы В. Быкава[2].

Такім чынам, на жаль, сёння беларуская мастацкая літаратура не выклікае цікавасці ў шырокага кола грамадзян нашай краіны, якія ў большасці сваёй ведаюць у асноўным класічны творы з праграм навучальных устаноў. Сучасныя аўтары амаль невядомы масаваму карыстальніку. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, вынікі апытання, праведзенага літаратурна-мастацкім часопісам «Полымя» у 2014 г. «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі»[3], вынікі праведзенага намі апытання студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Можна вызначыць некалькі прычын такой стуацыі. Да іх адносяцца, па-першае, незбалансаванасць сістэмы інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры, па-другое, адсутнасць іх якаснай рэкламы, шырокай папулярызацыі праз установы культуры, адукацыі, сродкі масавай інфармацыі, Інтэрнэт. Акрамя гэтага, адмоўным чынам адбіваецца складаная сітуацыя з моўным пытаннем. Нягледзячы на нарматыўна замацаванае дзвюхмоў'е, у Рэспубліцы Беларусь у сферы бытавых зносін, сродках масавай інфармацыі, адукацыйнай сферы і сферы культуры рэальна прэваліруе руская мова. Для нацыянальнай літаратуры гэта безумоўна неспрыяльна і прыводзіць да таго, што большасць публікацый у яе дакументным патоку складаюць рускамоўныя (54%), асабліва ў патоку асобных выданняў (60%). Можна прагназаваць, што з цягам часу колькасць твораў беларускай літаратуры на рускай мове будзе павялічвацца.

Такім чынам, стварылася складаная сітуацыя як для нацыянальнай літаратуры і культуры, так і для фарміравання нацыянальнай свядомасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзян Рэспублікі Беларусь, якая патрабуе прыняцця адпаведных мер. У прыватнасці, распрацоўкі комплекснай праграмы, якая павінна прадугледжваць забеспячэнне доступу карыстальнікаў да разнастайнага спектру інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры, у тым ліку і ў інтэрнэт-асяроддзі, а таксама іх папулярызацыю праз бібліятэкі, установы сацыякультурнай сферы, адукацыі, сродкі масавай інфармацыі, Інтэрнэт. Акрамя гэтага, неабходна дзяржаўная канцэпцыя захавання і папулярызацыі беларускай культуры і мовы, канчатковай мэтай якой павінна стаць свядомае ўспрыяцце ўсімі грамадзянамі нашай краіны беларускай культуры і мовы як сродка захавання адметнасці і ўнікальнасці беларусаў у свеце.

Забяспечыць доступ карыстальнікаў да разнастайных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры можна праз стварэнне іх збалансаванай сістэмы, якая ўключае розныя іх тыпы і віды на розных носьбітах і ў рознай форме (тэкставай, мультымедыйнай). На сённяшні час асноўную колькасць у патоку беларускай мастацкай літаратуры складаюць тэкставыя масавыя выданні на папяровым носьбіце (98%)[4]. Неабходна большую ўвагу звярнуць на падрыхтоўку і выданне навукова-масавых выданняў (1,5% у патоку)[5], у тым ліку і электронных, якія акрамя дакладных тэкстаў найбольш значных твораў пісьменнікаў утрымліваюць творы, якія не перавыдаваліся пры жыцці аўтара, артыкулы і лісты, якія раней не былі апублікаваныя, а таксама маюць даведачны апарат, які ўключае агляд творчасці пісьменніка, літаратуры ці пэўнай эпохі, літаратурна-крытычны і рэальны каментарыі. Такія выданні прызначаны не толькі для правядзення вольнага часу, а і для вывучэння мастацкай літаратуры. Пры гэтым рэалізуецца адзін з прынцыпаў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры, а менавіта прынцып комплекснасці мастацка-вобразных ведаў, які азначае, што дадзеныя рэсурсы павінны не толькі забаўляць, але і садзейнічаць фарміраванню асобы, развіццю яе інтэлекту, маральных якасцей і светапогляду[6].

Паколькі асноўнае месца ў патоку займаюць масавыя выданні паэтычных зборнікаў (66%)[7], аптымізацыі сістэмы інфармацыйных рсурсаў беларускай мастацкай літаратуры паспрыяе пашырэнне выпуску монавыданняў лепшых твораў эпічнага, драматургічнага і публіцыстычнага жанраў.

У сучасных умовах для стварэння збалансаванай сістэмы рэсурсаў, захавання і папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры акрамя выдання тэкставых дакументаў на папяровых носьбітах, неабходна павелічэнне колькасці электронных дакументаў офлайн- і онлайн-доступу, у тым ліку мультымедыйных, стварэнне электронных Інтэрнэт-бібліятэк. Гэта паспрыяе як пашырэнню доступу грамадзян нашай краіны да нацыянальных рэсурсаў мастацкай літаратуры, так і доступу грамадзян іншых краін да культурных здабыткаў нашага народа. Перспектыўным накірункам з'яўляецца стварэнне інтэрнэт-рэсурсаў, якія ў адзінай інфармацыйнай прасторы будуць аб'ядноўваць увесь спектр рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры як краіны цалкам, так і асобных рэгіёнаў. Для адлюстравання нацыянальнай літаратуры ў рэгіянальным аспекце мэтазгодна стварэнне на базе абласных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэк віртуальных літаратурных карт, якія будуць прадастаўляць даведачную інфармацыю аб пісьменніках, звязаных з рэгіёнам жыццём і творчасцю, тэксты іх твораў, інфармацыю аб літаратурным жыцці вобласці, навінках, мерапрыемствах, інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк, музеяў, зваротную сувязь з карыстальнікамі.

Вырашэнню праблемы паўнаты прадстаўлення твораў беларускай літаратуры ў Інтэрнэце, зручнага і эфектыўнага іх пошуку можа паспрыяць стварэнне спецыяльнага інтэрнэт-рэсурсу, рэалізаванага на базе сайта адной з буйнейшых бібліятэк Беларусі. Гэты рэсурс павінен быць інтэграваным, будавацца на карпаратыўнай аснове пры ўдзеле зацікаўленых арганізацый, якія маюць профільныя рэсурсы. У яго межах уся інфармацыя павінна структуравацца па адзіных прынцыпах і звязвацца сістэмай гіперспасылак.

Мэтазгодным з'яўляецца ўключэнне ў структуру дадзенага рэсурсу наступных радзелаў: 1) беларуская мастацкая літаратура, 2) беларускае літаратуразнаўства, 3) літаратурная адукацыя, 4) каталог інтэрнэт-рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства з гіперспасылкамі на іх, 5) форум для абмеркавання літаратурных твораў і падзей, які будзе звязаны гіперспасылкамі з сайтамі арганізацый-удзельніц.

Ядром дадзенага інтэграванага рэсурсу павінна стаць якасная электронная бібліятэка беларускай мастацкай літаратуры, якая можа быць сфарміравана на базе ствараемай нацыянальнай электроннай бібліятэкі. Папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры сярод шырокага кола крыстальнікаў, інфармацыйнага забеспячэння навуковай, адукацыйнай, прафесійнай сфер і сферы вольнага часу, будзе спрыяць далучэнне да поўных тэкстаў твораў у межах такой бібліятэкі гіперспасылак на іх кінаверсіі, тэатральныя пастаноўкі, інтэрпрэтацыю ў музыцы і жывапісу. Акрамя гэтага, дзякуючы інтэрнэт-тэхналогіям ёсць магчымасць дапоўніць рэсурсы віртуальнымі падарожжамі па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменнікаў, з падзеямі, апісанымі ў творах. У адзінай інфармацыйнай прасторы можа быць прадстаўлена літаратуразнаўчая, вучэбная інфармацыя, навіны літаратурнага жыцця, рэклама новых твораў, праектаў, мерапрыемстваў, бібліятэчных рэсурсаў, праектаў і выстаў. Такі шматпланавы рэсурс будзе карысным не толькі для азнаямлення сусветнай і нацыянальнай супольнасці са здабыткамі беларускай літаратуры, але і для навуковай і вучэбнай дзейнасці.

Арганізацыямі-ўдзельніцамі, якія могуць прадаставіць рэсурсы для азначанага інтэграванага рэсурсу могуць быць: 1) бібліятэкі (публічныя і спецыяльныя); 2) навуковыя ўстановы – Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; 3) архівы (Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў); 4) літаратурныя музеі (Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Віцебскі літаратурный музей і інш.); 5) выдавецтвы (Выдавецкі дом

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Звязда», «Мастацкая літаратура», «Кнігазбор» і інш.); 6) сродкі масавай інфармацыі – часопісы і газеты («Маладосць», «Полымя», «ЛІМ» і інш.).

Адным з фактараў, які спрыяе эфектыўнаму распаўсюджванню і выкарыстанню ў грамадстве інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры, з'яўляецца іх папулярызацыя. Вядучая роля ў гэтай справе належыць бібліятэцы, як сацыяльнаму інстытуту, функцыямі якога з'яўляюцца адукацыйная, выхаваўчая, асветніцкая, а адной з галоўных мэт дзейнасці бібліятэкара – трансляцыя нацыянальных культурных каштоўнасцей у грамадстве. Мэтазгодна пашырыць папулярызацыю беларускай літаратуры на сайтах бібліятэк, больш размяшчаць на іх віртуальныя кніжныя выставы з гіперспасылкамі на тэксты твораў, літаратурныя падарожжы, інфармацыю аб літаратурных навінках, праектах. Акрамя гэтага, неабходна змяненне падыходаў да арганізацыі і правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў, накіраваных на папулярызацыю беларускай мастацкай літаратуры. У іх аснове павінны быць творчыя крэатыўныя праекты, якія прадугледжваюць выкарыстанне сучасных педагагічных тэхналогій (інтэрактыўных, гульнёвых, дыялогавых), забяспечваюць актыўны ўдзел карыстальнікаў, дзеячоў культуры, мастацтва, навукі, спонсараў і з'яўляюцца падзеяй у культурным жыцці. Задачам папулярызацыі будзе адпавядаць арганізацыя ў межах гэтых праектаў сустрэч крэатыўных і цікавых аўтараў і супрацоўнікаў рэдакцый з чытацкай аўдыторыяй у бібліятэках і навучальных установах.

Неабходнасць павышэння цікавасці карыстальнікаў да беларускай мастацкай літаратуры патрабуе мэтанакіраванай дзейнасці ў гэтым накірунку не толькі ад бібліятэк, а таксама і ад выдавецтваў, рэдакцый літаратурных часопісаў і газет. Мэтазгодным з'яўляецца распрацоўка маркетынгавых мерапрыемстваў, перш за ўсё інтэрнэт-маркетынгу. У яго межах варта прадугледзіць стварэнне якасных сайтаў з неабходнай інфармацыяй і магчымасцю сувязі з карыстальнікамі, іх SEO-аптымізацыю, ажыццяўленне рэкламных кампаній, маркетынгавых мерапрыемстваў у сацыяльных сетках.

Такім чынам, вырашэнне праблемы распаўсюджвання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры ў грамадстве патрабуе комплекснага падыходу і намаганняў з боку розных устаноў сферы культуры, адукацыі і інфармацыі.

[1] Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования / Нац. б-ка Беларуси; сост.: М.Г. Пшибытко, О.В. Гаврилович. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2011. С. 61–62.

[2] Там же. С. 75.

[3] Не размінуцца з Атлантыдай класікі. «Круглы стол» па выніках акцыі «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі» // Полымя. 2015. № 3. С. 154–170.

[4] *Раманава Ж.Л.* Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: тэарэтыка-метадычны аспект: аўтарэф. дыс. ... канд. пед. наук: 05.25.03. Мінск, 2015. С. 11.

[5] Там же.

[6] Там же. С. 9.

[7] Там же. С. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ